# Лукашэнка станоўча ацаніў работы па развіцці і добраўпарадкаванні Магілёва

Аляксандр Лукашэнка ў час рабочай паездкі

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка 6 чэрвеня ў час рабочай паездкі даў шэраг дадатковых даручэнняў па далейшым развіцці і добраўпарадкаванні Магілёва, перадае карэспандэнт БЕЛТА.

“Малайчына. Нядрэнна, але гэта яшчэ асобныя зярняткі. Горад павінен быць прыгожым”, – сказаў Аляксандр Лукашэнка, заслухаўшы даклад мэра Уладзіміра Цумарава.

Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што работы па добраўпарадкаванні праведзены і ў іншых абласных цэнтрах, жыхарам якіх ёсць чым ганарыцца.

Асобнай тэмай стала рэалізацыя розных праектаў па развіцці гарадской інфраструктуры, якія ўжо рэалізаваны ў Магілёве ў 2017-2020 гадах. Напрыклад, за гэты час былі капітальна адрамантаваны многія аб’екты дарожнай сеткі (Чавуская, Мінская шаша, мост і пуцеправод цераз чыгуначныя пуці па праспекце Міру) і сацыяльнай іфраструктуры (Палац культуры вобласці, тэнісныя корты і футбольны манеж, сярэдняя школа нумар 46, радзільны дом Магілёўскай гарадской бальніцы хуткай медыцынскай дапамогі).

Прэзідэнт азнаёміўся з планамі горада па будаўніцтве і праектаванні шэрага аб’ектаў. У іх ліку – кардыяхірургічны корпус Магілёўскай абласной бальніцы, паліклінікі ў жылым раёне “Казіміраўка”, ФАК з басейнамі ў мікрараёне “Фаціна”, а таксама будаўніцтва пуцеправода-дублёра па вул.Якубоўскага – Загараднай шашы. Што датычыцца апошняга аб’екта, то Аляксандр Лукашэнка зрабіў акцэнт на крыніцах фінансавання, адзначыўшы, што на будаўніцтва гэтага пуцеправода можна накіраваць сродкі,

сэканомленыя пры рэканструкцыі іншых дарог па краіне.

Кіраўніку дзяржавы далажылі аб праведзеных і запланаваных работах па добраўпарадкаванні ландшафтна-рэкрэацыйнага комплексу “Падніколле”. Тут, у прыватнасці, прадугледжана ўладкаванне спартыўных і дзіцячых пляцовак, катка з паркавым павільёнам, вяровачнага гарадка, парку атракцыёнаў, пляжнай зоны і ў перспектыве — турыстычнага комплексу. “Чым раней, тым лепш, — пракаменціраваў Прэзідэнт ініцыятыву па ўзвядзенні турыстычнага комплексу. — Людзей шмат, жадаючых наведаць. Чаму не развіваць?”

“Цяпер гэта ўсё трэба аб’яднаць так, каб горад быў цэласным комплексам. Трэба нешта яшчэ нам зрабіць за будучую пяцігодку, каб магіляўчане ганарыліся”, — падкрэсліў беларускі лідар, размаўляючы з людзьмі пры наведванні Свята-Мікольскага жаночага манастыра.

Аляксандр Лукашэнка падзяліўся ўспамінамі, што ў гады вучобы ў Магілёве ён таксама бываў на тэрыторыі Падніколля, але тады гэтыя мясціны былі зусім непрывабныя з выгляду. “Гэта сметнік быў”, — сказаў ён.

Ён адзначыў, што так склалася, што Магілёў і Брэст у свой час адсталі ў добраўпарадкаванні, у адрозненне ад Гомеля, Віцебска або Гродна. “Але надышоў час, адрадзілі Брэст і многае зрабілі для Магілёва, але яшчэ не ўсё”, — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Асаблівы акцэнт Прэзідэнт зрабіў і на прамысловай сферы горада, даручыўшы правесці ў гэтым плане рэвізію і вызначыцца з тым, як выкарыстоўваць незадзейнічаныя вытворчыя плошчы. “Нельга страціць гэтыя прамысловыя кропкі. Знойдуцца інвестары і з задавальненнем прыйдуць у Магілёў і будуць працаваць”, — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Кіраўніку дзяржавы падрабязна далажылі аб сацыяльна-эканамічным развіцці Магілёўскай вобласці. У прыватнасці, у рэгіёне па выніках студзеня-красавіка дасягнуты добрыя паказчыкі па вытворчасці сельскагаспадарчай прадукцыі (103

працэнты да аналагічнага перыяду мінулага года), у будаўніцтве (101,8 працэнта), у рознічным тавараабароце ў гандлі (104,2 працэнта).

БЕЛТА